Алесь Шамак

кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
загадчык аддзела традыцыйнай культуры
і аматарскай творчасці
Інстытута культуры Беларусі
(г. Мінск, Беларусь)

# Структура традыцыйнай культуры Беларусі

Традыцыя — гэта элементы сацыяльнай і культурнай спадчыны, якія перадаюцца ад пакалення да пакалення і зберагаюцца ў пэўных грамадствах, класах і сацыяльных групах на працягу значнага часу [5]. Традыцыя ахоплівае аб'екты сацыяльна-культурнай спадчыны (матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці), працэс сацыяльнага наследавання і яго спосабы.

Традыцыі функцыянуюць ва ўсіх сацыяльных сістэмах і ў пэўнай меры з'яўляюцца неабходнай умовай іх існавання. Сацыяльная дыферэнцыяцыя вызначае падзел традыцыйнай культуры. Адсюль традыцыйная культура як цэласная падсістэма складаецца з традыцыйных субкультур, якія сфарміравалі значныя сацыяльныя групы грамадства. «"Кожны сацыяльны пласт" ствараў блізкае яму мастацтва, таму ў кожным соцыуме існавала свая традыцыйная культура, якая абслугоўвала гэты клас. Пры тым у кожнай субкультуры фарміруецца адпаведная выява свету і адмысловы лад жыцця, які адпавядае запатрабаванням соцыуму» [4, *14*].



Найбольш значныя падсістэмы традыцыйнай культуры Беларусі ў XIX ст. — рэлігійная, сялянская, гарадская, шляхецкая. Своеасаблівым феноменам мінулага была субкультура беларускіх мястэчак.

Яшчэ ў XIX — пачатку XX ст. культурныя адрозненні класаў на Беларусі вызначаліся выразна. Кожны клас, сацыяльная група валодалі асобнымі традыцыямі і былі іх носьбітамі.

Зыходзячы з вышэйвыкладзенага, неабходна падкрэсліць, што традыцыйная культура не можа зводзіцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

толькі да сялянскай, як схільны і сёння вызначаць яе асобныя даследчыкі. Тут мы сутыкаемся з устойлівымі падыходамі да традыцыйнай культуры як аб’екта даследавання, сфарміраванымі ў перыяд існавання савецкай улады і камуністычнай ідэалогіі.

У межах класавага падыходу да культуры ў часы СССР да традыцыйнай культуры адносілі элементы, створаныя народам, пад якім разумеліся толькі пралетарскія слаі грамадства і, у першую чаргу, сялянства. Такі падыход, найбольш яскрава сфармуляваны У. Я. Пропам [3] і закансерваваны марксісцка-ленінскай метадалогіяй, начыста выключыў са структуры традыцыйнай культуры тыя субкультуры і іх носьбітаў, якія належалі іншым сацыяльным групам дарэвалюцыйнага грамадства: прывілеяванаму класу былога беларускага грамадства — шляхце, у значнай ступені, гараджанам, не прызнаваў традыцый вернікаў рэлігійных канфесій.

Вызначаць падсістэму традыцыйнай культуры як «народную» ў наш час азначае стымуляваць барацьбу паміж рознымі сацыялагічнымі школамі, якія даюць паняццю «народ» сваё вызначэнне. Вядомы французскі сацыёлаг П. Бурдье лічыць наступнае: «Каб некалькі патлумачыць дыскусію з нагоды “народа” ці “народнага”, трэба падумаць, што “народ” ці “народнае” (народнае мастацтва, народная рэлігія, народная медыцына і г. д.) служыць у першую чаргу стаўкай у барацьбе паміж інтэлектуаламі» [1].



За два апошнія дзесяцігоддзі ў Беларусі адбыліся значныя сацыяльна-культурныя змены, у выніку многія пытанні культуры, якія лічыліся вырашанымі, зноў сталі праблемнымі. Сярод іх, пытанне аб традыцыйнай культуры і носьбітах традыцыйнай культуры.

На сёння мы павінны адзначыць неадпаведнасць паміж культурай і новай сацыяльнай структурай беларускага грамадства. Рэформы канца XX — пачатку XXI ст. у Беларусі характарызуюцца пэўнымі структурнымі змяненнямі ў эканамічным і сацыяльна-палітычным жыцці грамадства. Сацыяльныя пераўтварэнні з’яўляюцца адным з найбольш значных фактараў змен у культуры.

Доўгатэрміновае існаванне традыцый у мінулым само па сабе яшчэ не вызначае яе сучаснага значэння. Жыццядзейнасць традыцыі звязана з яе магчымым далейшым развіццём новымі пакаленнямі грамадства і ў новых гістарычных умовах. Кожнае пакаленне з неабходнасцю ўспрымае шэраг традыцый, але разам з тым у пэўнай ступені здзяйсняе выбар тых ці іншых традыцый і тым самым выбірае не толькі сваю будучыню, але і сваё мінулае [5].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прыватная ўласнасць, рынкавая эканоміка адраджаюць і фарміруюць у Беларусі эканамічна прывілеяваны клас — буржуазію. Станаўленне новых эканамічных адносін вядзе да ўзмацнення ўплыву ў беларускім грамадстве тых сацыяльных груп, чый дабрабыт залежыць ад прадпрымальніцкай дзейнасці. Калі адкінуць усе хібы першапачатковага накаплення капіталу, то сярод тыповых буржуазных якасцей можна вылучыць працавітасць, ашчаднасць, практыцызм, метадычнасць, дзелавую сумленнасць, карпаратыўную этыку. Але ж носьбіты гэтых традыцый самі ў працэсе фарміравання. А наперадзе яшчэ фарміраванне сярэдняга класа і вырашэнне яго культурных задач.

Працягваюць сваё жыццё элементы традыцыйнай культуры беларускай шляхты. Культурная спадчына шляхты існавала на працягу 5-і стагоддзяў. У пэўныя перыяды гісторыі цікавасць да яе павялічвалася, і «рэцэпцыя» гэтай спадчыны аказвала стымулюючае ўздзеянне на культурнае развіццё Беларусі, што адбываецца і ў XXI ст. Аднаўляюцца замкі, палацы, слуцкія паясы, выконваюцца ці экспануюцца творы мастацтва, створаныя шляхтай ці для шляхты. Нашчадкі экспрапрыіраванага бальшавікамі дваранства і шляхты ўзгадваюць пра сваіх продкаў і іх традыцыі. Аднаўленне элементаў культуры і зварот да лепшых традыцый заможнага класа, які ўсведамляў сябе часткай нацыі, — аб’ектыўная задача. Тым больш, што латэнтныя працэсы ў сацыяльных групах, якія лічаць сябе спадкаемцамі гэтай субкультуры, паціху адбываюцца.



Сучаснае беларускае грамадства з’яўляецца пераважна гарадскім, колькасць гарадскога насельніцтва перавышае колькасць сельскага ў некалькі разоў. З’яўленне буйных сучасных гарадоў пацягнула за сабой глыбокія змены ў ладзе жыцця людзей.

У той жа час спецыялісты пачалі адзначаць такую з’яву сучаснай культуры, як гарадскі фальклор [4]. А побач з гэтым фарміруюцца культурныя плыні, у якіх асобныя групы гараджан робяць спробу аднавіць і ўвесці ў культурны абарот традыцыі вясковай культуры, язычніцкія (неаязычнікі, раднаверы), сярэдневяковай культуры (рыцарскія клубы, рыцарскія фестывалі). Ці сфарміруюцца на падмурку гэтых захапленняў сацыяльныя групы, якія стануць носьбітамі выбраных традыцый? На сённяшні момант адказаць на гэта пытанне немагчыма.

Стварэнне ў апошнія дзесяцігоддзі аграгарадкоў сфарміравала сацыяльную групу грамадства, якая займае пазіцыю паміж вяскоўцамі і гараджанамі. Асобныя элементы культурнага жыцця мястэчак Беларусі XVIII — XIX стст. могуць быць выкарыстаны ў сучасных агра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гарадках. Лепшыя традыцыі местачкоўцаў трэба вывучыць, вылучыць каштоўнае і ўвесці ў культуру аграгараджан.

Адчужэнне сялян ад зямлі, стварэнне калгасаў, мэтанакіраваная барацьба з традыцыямі сялянскай культуры ў савецкія часы, пакінулі свой негатыў. Да таго ж урбаністычны прагрэс ахапіў і вёску. Мы стаім на парозе знікнення сялянскай традыцыйнай культуры 2-й паловы XIX — пачатку XX ст., бо засталася вельмі малая колькасць носьбітаў фальклору і традыцыйнай культуры таго перыяду. Стварэнне, хай і недасканалай, юрыдычнай базы для майстроў народных промыслаў, дало пэўны вынік у захаванні традыцыйных рамёстваў беларусаў. На жаль, да гэтага часу няма захадаў, каб стымуляваць захаванне элементаў вусна-паэтычнай творчасці вясковай традыцыйнай культуры.

З 90-х гг. XX ст. пачала адраджацца культура рэлігійных канфесій, якую старанна руйнавалі бальшавікі і камуністы. Праваслаўе, каталіцызм і пратэстантызм актыўна функцыянуюць і фарміруюць новае пакаленне носьбітаў сваіх традыцый. Больш таго розныя рэлігійныя канфесіі і іх храмы займаюць актыўную пазіцыю, патрабуюць дазволу дзейнічаць у розных сацыяльных групах беларускага грамадства (у адукацыйных установах, вайсковых частках, афіцыйных мерапрыемствах) на правах партнёрства з дзяржавай. І вынікі ёсць. Царква досыць паспяхова фарміруе носьбітаў сваіх традыцый.

Падсумоўваючы вынікі разгляду традыцыйнай культуры з пазіцый яе суб’ектаў, мы лічым што лепшыя, не згубіўшыя сваю каштоўнасць элементы культуры канца XIX — пачатку XX ст. розных сацыяльных груп беларускага грамадства павінны захоўвацца і ўводзіцца ў культуру сучаснага грамадства.

Сусветная практыка сведчыць: у адной краіне могуць аб’ядноўвацца два тыпы культуры — індустрыяльна-ўрбаністычны і этнічны, арыентаваны на традыцыю. Прыкладам такога спалучэння з’яўляюцца Кітай, Індыя, Японія.

Пры ўсёй складанасці сітуацыі ў сферы традыцыйнай культуры сёння неабходна захоўваць традыцыі культуры ўсіх сацыяльных груп беларускага грамадства.

Па-першае, ніводная падсістэма культуры не здольна стварыць вычарпальнае апісанне рэальнага свету і задаволіць усе сацыяльныя групы. Грунтуючыся на нейкім адным кірунку культуры, мы адмаўляем іншыя магчымасці. Да таго ж, з цягам часу, магчымасці творчага развіцця аднаго кірунку непазбежна вычэрпваюцца і культура дэградуе.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вяртаючы ў культурны зварот беларускага грамадства традыцыі гараджан, шляхты, вернікаў рэлігійных канфесій, мы павялічваем «аб'ём» культурнай спадчыны нашай краіны.

*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. *Бурдье, П.* Начало / П. Бурдье. — М., 1994.
2. *Маркарян, Э. С.* Узловые проблемы теории культурной традиции / Э. С. Маркарян // Сов. этнография. — 1981. — № 2.
3. *Пропп, В. Я.* Русские аграрные праздники / В. Я. Пропп. — Л., 1963.
4. *Соколов, К. Б.* Субкультурная стратификация и городской фольклор / К. Б. Соколов // Традиционная культура. — 2000. — № 1.
5. Традиция // Философский энциклопедический словарь. — М. : Сов. энциклопедия, 1983.
6. *Шамак, А. А.* Традиционая культура : к уточнению содержания и объема понятия / А. А. Шамак // Традиционая культура как стратегический ресурс устойчивого развития общества ; Материалы Междунар. форума (17—18 апреля 2012 г.). — Могилев, 2012. — С. 29—35.
7. *Шамак, А. А.* Традыцыйная культура Беларусі : удакладненне зместу і структуры / А. А. Шамак // Веснік Інстытута культуры Беларусі. — 2012. — С. 89—92.



Адам Мальдзіс

ганаровы старшыня
Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў,
доктар філалагічных навук, прафесар,
супрацоўнік аддзела міжнароднай
сацыякультурнай дзейнасці Інстытута культуры
Беларусі (г. Мінск, Беларусь)

# Мемуары Адама Багдановіча як гістарычная крыніца і мастацкі твор
## (да 150-годдзя з дня нараджэння аўтара)

Калегі па рабоце часам пытаюцца ў мяне: «Вось Вы напісалі кнігу "Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі", першапачатковая назва якой — "Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя". А дзе іншыя стагоддзі, дзе стагоддзе XIX, куды больш багатае на мемуарыстыку, чым папярэдняе? Калі будзе наступная кніга на тую ж тэму?»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ